25 ЛЮТАГА 2024 ГОДА

АДЗІНЫ ДЗЕНЬ ГАЛАСАВАННЯ

ВЫБІРАЕМ РАЗАМ!

# ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ Ў БЕЛАРУСІ ПРАХОДЗІЦЬ СПАКОЙНА

## Аб гэтым расказаў кіраўнік штаба місіі наглядальнікаў ад СНД Леанід Анфімаў

**«Вельмі спакойна праходзіць гэта выбарчая кампанія. Кратна, у разы зменшылася колькасць скаргаў. У Вярхоўны Суд паступіла ўсяго шэсць заяў. Мы разбіралі падрабязна гэтыя заявы, яны не зусім абгрунтаваныя, і цалкам заканамерна, што ў іх задавальненні было адмоўлена заяўнікам», — сказаў Леанід Анфімаў.**

Паводле яго слоў, у Генеральную пракуратуру паступіла ўсяго толькі дзве заявы, якія маюць тэндэнцыйны характар. «Больш даецца нават не скарга, а ацэнка дзеючага выбарчага заканадаўства Беларусі і парадку вылучэння кандыдатаў у дэпутаты», — адзначыў ён.

Леанід Анфімаў удакладніў, што ў місію наглядальнікаў ад СНД ужо зарэгістраваны 186 чалавек. «Хоць мы раней анансавалі, што будзе недзе 150 чалавек. Гэта лічба ўжо даўно перавышана, таму што, сапраўды, такую непадробную цікавасць у краін СНД выклікаюць гэтыя выбары ў Беларусі. Напэўна, людзі хочуць на ўласныя вочы пераканацца, наколькі спакойна ў нас у краіне жывецца простаму грамадзяніну», — расказаў кіраўнік штаба місіі.

«У прафесійным плане місія наглядальнікаў прадстаўлена кіраўнікамі і членамі цэнтральных выбарчых камісій краін СНД, прадстаўнікамі дзяржаўных органаў і кіраўнікамі шэрагу дзяржорганаў, дэпутатамі парламента. Прафесійны склад з даволі высокім узроўнем кампетэнцый», — падкрэсліў Леанід Анфімаў.

Адказваючы на пытанне, як рашэнне не запрашаць назіральнікаў ад АБСЕ адаб'ецца на іміджы выбарчай кампаніі, Леанід Анфімаў зазначыў: «Калі ёсць місія назіральнікаў ад СНД, ад ШАС, ёсць назіральнікі па запрашэнні Цэнтральнай выбарчай камісіі Рэспублікі Беларусь, то, напэўна, заключэнне будзе вельмі аб'ектыўным аб тым, наколькі дэмакратычна, свабодна і з забеспячэннем волевыяўлення грамадзян пройдуць гэтыя выбары».

«Раней, калі мы праводзілі такія місіі назірання за электаральнымі кампаніямі, у нас не было нейкіх сур'ёзных заўваг і нараканняў наконт парушэння ўнутранага заканадаўства або міжнародных нормаў аб правядзенні выбараў у Беларусі. Таму мы, напэўна, залішне фетышызуем АБСЕ з яе інстытутамі», — канстатаваў ён.

«Не будзе АБСЕ, і што? — задаўся пытаннем кіраўнік штаба місіі. — Ці яе заключэнне для нас ісціна ў апошняй інстанцыі? У выніку выбары ў нашай краіне мы праводзім не для Еўропы, не для Амерыкі. Мы іх праводзім для сябе, для свайго народа. Мы выбіраем прадстаўнічы і заканадаўчы орган улады, які будзе адстойваць інтарэсы краіны і народа, у тым ліку на міжнароднай арэне. Думаю, што без місіі наглядальнікаў ад АБСЕ парламент нашай рэспублікі будзе прызнаны легітымным».

**Паводле БелТА.**